БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК [821.161.3.09-3 + 821.162.1.09-3]“18/19”

(ознакомительный фрагмент)

БАХАНОВІЧ
Наталля Леанідаўна

# КАНЦЭПЦЫЯ АСОБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ПРОЗЕ МАЛЫХ ЖАНРАЎ НА ПАМЕЖЖЫ XIX–XX СТСТ.

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасцях 10.01.01 – беларуская літаратура
10.01.03 – літаратура народаў краін замежжа (польская)

МІНСК, 2012

Работа выканана ў Дзяржаўнай навуковай установе
“Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”

Навуковы кіраўнік — **Максімовіч Валерый Аляксандравіч,** доктар філалагічных навук, дацэнт, в.а. намесніка дырэктара ДНУ “Інстытут філасофіі НАН Беларусі”

Афіцыйныя апаненты: — **Мельнікава Зоя Пятроўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускага літаратуразнаўства УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

**Еўмянькоў Віталь Іванавіч**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры журналістыкі УА “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”

Апаніруючая арганізацыя — УА “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”

Абарона адбудзецца 28 верасня 2012 г. у 14.30 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 327–63–78).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы 5 ліпеня 2012 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — Хмяльніцкі М.М.

# УВОДЗІНЫ

У сучасных працэсах пошуку перспектыўных стратэгій інавацыйнага развіцця актуалізуецца пытанне чалавечага фактару – цэнтральнага звяна ў ланцугу жыццядзейнасці інфармацыйнага грамадства, якое адчувае патрэбу ў развітай, свядомай, унутрана незалежнай асобе, здольнай да аналізу як уласнага жыцця, так і палітыкі, эканомікі, культуры ў дзяржаве. Пры гэтым асаблівую ролю набывае ўменне ўлічваць назапашаны вопыт, для таго каб пастаўленыя задачы былі рэалізаваны з найменшымі для чалавека фізічнымі і псіхічнымі выдаткамі. Homo sapiens як стваральнік, носьбіт і выканаўца праграм узбагачэння духоўна-інтэлектуальнага патэнцыялу нацыі нязменна выступае цэнтральнай праблемай навуковых ведаў. На фарміраванне адэкватнага патрабаванням сучаснасці чалавека здольна паўплываць і літаратуразнаўства, што ўзмацняе актуальнасць пытання мастацкай канцэпцыі асобы.

Храналагічныя рамкі даследавання абумоўлены замацаваннем чалавека на першым плане культурна-філасофскай парадыгмы мяжы XIX–XX стст. Менавіта гэты час становіцца прасторай фарміравання новай канцэпцыі асобы, якая сведчыць пра трансфармацыю традыцыйных уяўленняў аб рэчаіснасці. Немагчыма абмінуць і сувязь паміж мяжой стагоддзяў і мяжой тысячагоддзяў: у разглядаемы перыяд адбываўся пераход ад феадальнага да капіталістычнага грамадства, сёння – ад індустрыяльнага да інфармацыйнага. Зварот да мінулага спрыяе асэнсаванню чалавекам сучаснасці, знаходжанню жыццёвых арыенціраў ва ўмовах дынамічных працэсаў глабалізацыі і інфарматызацыі.

Выбар беларуска-польскага літаратуразнаўчага вектару для ажыццяўлення кампаратыўнага аналізу абумоўлены як трываласцю геаграфічных і гістарычных сувязей двух народаў ад Сярэднявечча і да сённяшняга часу, так і арыентацыяй айчыннай літаратуры на суседнюю ў пачатку мінулага стагоддзя. Зварот да малафарматнай прозы як аб'екта даследавання перыяду, калі ў польскім мастацтве слова ўпэўненыя пазіцыі займалі аб'ёмныя жанравыя формы, выкліканы не яе дамінаваннем у тагачасным айчынным кантэксце – прызнаная навукоўцамі мабільнасць малых жанраў арыентавана на ўзнаўленне найбольш тонкіх змен у паводзінах і мысленні чалавека. Разгляд канцэпцыі асобы на гэтым матэрыяле дазваляе выявіць непадуладныя вялікім формам зрухі ў жыцці, што прадвызначылі ці маглі б прадвызначыць шляхі беларускага і польскага грамадства ў XX, XXI стст.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыя непасрэдна звязана з распрацоўкай і выкананнем планавых навуковых тэм аддзела ўзаемасувязей літаратур ДНУ "Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі" – "Беларуская і еўрапейскія літаратуры ў агульнай прасторы маральных каштоўнасцей" (2006–2010 гг., № д/р 20072154 ад 09.08.2007), "Нацыянальныя тыпы ментальнасці ў беларускай і еўрапейскіх літаратурах: ідэйна-эстэтычная спецыфіка, стылявая эвалюцыя, перакладчыцкая інтэрпрэтацыя" (2011–2015 гг., № д/р 20110553 ад 14.04.2011).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта даследавання – выявіць канцэпцыю асобы як анталагічна-мастацкі комплекс ідэй зыходзячы з мадэлей яе рэалізацыі ў межах беларускай і польскай прозы малых жанраў і ва ўзаемасувязі з сацыякультурным кантэкстам мяжы XIX–XX стст.

Навуковая рэалізацыя мэты даследавання прадугледжвае пастаноўку і вырашэнне наступных задач:

- раскрыць гістарычна-тэарэтычныя аспекты фарміравання мастацкай канцэпцыі асобы;
- вылучыць канкрэтныя мадэлі, прыёмы і спосабы рэпрэзентацыі канцэпцыі асобы праз аналіз вобразна-стылявой і сюжэтна-кампазіцыйнай сістэм твораў;
- рэканструяваць з улікам супадзенняў і разыходжанняў канцэпцыю асобы і яе функцыянальную скіраванасць у беларускай і польскай прозе малых жанраў;
- вызначыць у параўнальным аспекце спецыфіку і матывацыйны патэнцыял канцэпцыі творчай асобы ў кантэксце філасофска-эстэтычных пошукаў аўтараў.

**Аб'ектам** даследавання выступае беларуская і польская проза малых жанраў на памежжы XIX–XX стст. у сістэме тагачасных творчых метадаў (М. Багдановіч, Ф. Багушэвіч, З. Бядуля, М. Гарэцкі, Я. Колас, В. Ластоўскі, С. Палуян, Цётка і інш.; Э. Ажэшка, Ф. Брадоўскі, Е. Жулаўскі, У. Рэймант, К. Тэтмаер і інш.). Выбар аб'екта абумоўлены рэпрэзентатыўным патэнцыялам прозы малых жанраў, істотным у працэсе ўзнаўлення фундаментальных асноў быцця чалавека, якія неабходны для раскрыцця тэмы дысертацыі.

**Прадмет** даследавання – мастацкая канцэпцыя асобы як індыкатар нацыянальна-культурных працэсаў і фактар вырашэння грамадска-гістарычных задач.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. На фоне заходнееўрапейскага ментальна-эстэтычнага асэнсавання мяжы XIX–XX стст. як "канца" беларуская і польская сацыякультурная рэчаіснасць вызначаецца як свайго роду "пачатак"; момант пераходнасці лучыць названыя сітуацыі. У беларускай і польскай літаратурах аднолькава заяўляюць пра сябе рэалістычная і мадэрнісцкая канцэпцыі асобы, але ў кожным выпадку з рознай ступенню інтэнсіўнасці. Агульныя тэндэнцыі развіцця беларускай і польскай прозы малых жанраў на памежжы стагоддзяў ілюструюць змены ва ўяўленнях пісьменнікаў пра чалавека як асобу.

2. Мастацкая канцэпцыя асобы рэалізуецца беларускімі і польскімі аўтарамі праз шэраг канкрэтных мадэлей: зварот да тэмы чалавечай старасці (Я. Колас, В. Ластоўскі, Цётка; Э. Ажэшка, Ф. Брадоўскі, У. Рэймант), актуалізацыя старажытных уяўленняў аб цыклічнасці светабудовы (Я. Колас, В. Ластоўскі, С. Палуян; У. Рэймант, К. Тэтмаер), адаптацыя філасофскага імператыву творчай рэалізацыі чалавека (М. Багдановіч, З. Бядуля, М. Гарэцкі; Е. Жулаўскі, К. Тэтмаер). Канцэпцыя асобы выяўляецца як на змястоўна-тэматычным (вобразы герояў), так і на фармальна-стылявым (сімволіка-алегарычныя вобразы пейзажу, рэчаў, жывёл і інш.) узроўнях твораў.

3. Канцэпцыя асобы ў беларускай і польскай рэалістычнай прозе малых жанраў тыпалагічна супадае – гэта вобраз чалавека ў памежным анталагічным стане, што выступае індыкатарам балансавання грамадства ў пераходнай сітуацыі (В. Ластоўскі, Цётка; Э. Ажэшка, Ф. Брадоўскі). Пазітыўнае засваенне прадстаўнікамі рэалістычнага і мадэрнісцкага творчых метадаў цыклічнай мадэлі культурна-гістарычнага хранатопа сведчыць аб канструктыўнасці канцэпцыі асобы, далучанай да нацыянальных ідэй народаў. Разыходжанне ў адраджэнскіх прыярытэтах абумоўлівае спецыфіку функцыянавання гэтай катэгорыі: у беларускай літаратуры дамінуе матыў духоўна-асобаснага развіцця чалавека як падставы для ажыццяўлення сацыяльна значных змен (Я. Колас, В. Ластоўскі, С. Палуян), у польскай – матыў чакання спрыяльнага моманту для актывізацыі руху за незалежнасць, з якой звязваецца вырашэнне надзённых грамадскіх праблем (У. Рэймант, К. Тэтмаер).

4. Канцэпцыя творчай асобы ў мадэрнісцкай малафарматнай прозе нясе адзнаку трагізму, які абумоўлены ўздзеяннем агульнаеўрапейскіх

сацыякультурных тэндэнцый: узвышэнне статусу мастака і мастацтва і імкненне героя ўзняцца над людзьмі прыводзяць яго да духоўнай дэградацыі (З. Бядуля); прафесіяналізацыя творчасці і спроба асобы за кошт гэтага дасягнуць матэрыяльнай стабільнасці правакуюць выключны і для мадэрнізму канфлікт мастака і філістара ў адным чалавеку (К. Тэтмаер). Параўнальна-тыпалагічны аналіз вобраза крэатыўнага героя ў лірычнай прозе выяўляе розны матывацыйны патэнцыял аўтарскіх канцэпцый асобы: у беларускай літаратуры – вылучэнне ідэі фарміравання эстэтычна актыўнага ў індывідуальным і нацыянальным маштабах суб'екта ў самастойны вектар адраджэнскай праграмы (З. Бядуля), у польскай – пранікненне ў глыбіні падсвядомасці чалавека з мэтай спасціжэння яго трансцэндэнтнай сутнасці (Е. Жулаўскі).

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя ў поўным аб'ёме з'яўляецца вынікам самастойнай працы аўтара. Упершыню на аснове разгляду фактычнага матэрыялу літаратурнага, гістарычнага і філасофскага зместу праводзіцца параўнальна-тыпалагічны аналіз мастацкай канцэпцыі асобы ў беларускай і польскай прозе малых жанраў на мяжы XIX–XX стст. У цэнтр увагі змяшчаюцца такія аспекты чалавечага быцця, як знаходжанне ў памежнай сітуацыі і імкненне быць творчым. Артыкулы, у якіх апублікаваны вынікі даследавання, напісаны без суаўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Прамежкавыя і выніковыя палажэнні даследавання былі прадстаўлены на 11 рэспубліканскіх і міжнародных (у тым ліку 5 замежных) навуковых канферэнцыях: VI Танкаўскіх чытаннях, прысвечаных 125-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа і 95-годдзю з дня нараджэння М. Танка "Ёсць адна Песня песняў – пра Радзіму..." (Мінск, 25–26 кастрычніка 2007 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Ідэі. Пошукі. Рашэнні" (Мінск, 28 сакавіка 2008 г.); X Міжнароднай навукова-метадычнай канферэнцыі "Праблемы славянскай культуры і цывілізацыі" (Усурыйск, 22 мая 2008 г.); XVI Міжнароднай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых навукоўцаў "Ламаносаў" (Масква, 13–17 красавіка 2009 г.); Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Выяўленча-мастацкія, арганізацыйныя і ідэалагічныя праблемы сучаснай беларускай літаратуры ў яе сувязях з грамадскімі практыкамі" (Мінск, 19–20 мая 2009 г.); XVIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Мова і культура" ім. праф. С. Бурага (Кіеў, 22–26 мая 2009 г.); Юбілейнай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 40-годдзю ГДУ ім. Ф. Скарыны (Гомель, 11 чэрвеня 2009 г.); XVI Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Шлях да ўзаемнасці" (Беласток, 25–26 верасня

2009 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Творчасць І. Навуменкі: славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст", прысвечанай 85-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі (Мінск, 16 лютага 2010 г.); XVII Міжнароднай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых навукоўцаў "Ламаносаў" (Масква, 12–15 красавіка 2010 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры", прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння класіка (Мінск, 25–26 лістапада 2011 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі даследавання па тэме дысертацыі адлюстраваны ў 16 публікацыях, сярод якіх 5 артыкулаў у рэцэнзаваных часопісах (у тым ліку 1 замежным) – 2,8 аўт. арк., 2 артыкулы ў навуковых зборніках (у тым ліку 1 замежным) – 0,8 аўт. арк., 9 у матэрыялах і тэзісах канферэнцый (у тым ліку 4 замежных) – 2,6 аўт. арк. Агульны аб'ём апублікаваных тэкстаў складае 6,2 аўт. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, заключэння і бібліяграфічнага спісу. Агульны аб'ём дысертацыі складае 140 старонак: асноўны тэкст – 115, бібліяграфічны спіс – 25 (312 пазіцый, з якіх 296 – спіс выкарыстаных крыніц, у тым ліку 88 польскамоўных, 16 – спіс публікацый дысертанта).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Раздзел 1 **"Мастацкая канцэпцыя асобы: гісторыя і тэорыя пытання"** прысвечаны выяўленню комплексу фактараў, якія аказваюць уплыў на фарміраванне канцэпцыі асобы ў беларускай і польскай літаратурах памежжа стагоддзяў, разгляду літаратуразнаўчых парадыгмаў аналізу вобраза чалавека ў сістэме твора, вылучэнню прыярытэтных вектараў дадзенага даследавання. Гэты раздзел складаецца з трох падраздзелаў.

У падраздзеле 1.1 **"Беларуская і польская літаратуры на мяжы XIX–XX стст.: гістарычны экскурс"** разглядаюцца тагачасныя нацыянальныя кантэксты фарміравання мастацкай канцэпцыі асобы. Адзначаецца, што на ўяўленні аб чалавеку аказваюць уздзеянне розныя фактары, вызначальнымі сярод якіх з'яўляюцца актывізацыя індывідуальнага і грамадскага патэнцыялу, росквіт нацыянальных літаратур. Многія краіны Заходняй Еўропы на памежжы стагоддзяў перажываюць дэкаданс, таму іх бачанне гісторыі і культуры вызначаецца як свайго роду "канец", а для

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў рэцэнзаваных выданнях

1. Бахановіч, Н.Л. Асоба ў пераходным перыядзе: сімвалічнае прачытанне прозы "малога жанру" / Н.Л. Бахановіч // Вестн. Мин. гос. лингвист. ун-та. Сер. 1, Филология. – 2008. – № 5. – С. 190–197.

2. Бахановіч, Н.Л. Літаратуразнаўчае даследаванне асобы: метадалагічны і аксіялагічны аспекты / Н.Л. Бахановіч // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та. – 2008. – № 4. – С. 48–52.

3. Бахановіч, Н.Л. Асоба ў цыклічнай мадэлі нацыянальнага быцця: на матэрыяле твораў беларускай і польскай літаратур пачатку XX ст. / Н.Л. Бахановіч // Род. слова. – 2009. – № 5. – С. 28–31.

4. Баханович, Н.Л. Творчество и эстетическое на рубеже XIX–XX ст.: художественно-философский экскурс / Н.Л. Баханович // Мова і культура / Київ. нац. ун-т, Вид. дом Дмитра Бураго. – Вип. 12, т. 2 / редкол.: Д. Бураго (гол. ред.) [і інш.]. – Київ, 2009. – С. 260–266.

5. Бахановіч, Н.Л. Канцэпцыя творчай асобы ў лірычнай прозе Змітрака Бядулі / Н.Л. Бахановіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2011. – № 1. – С. 88–93.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

6. Бахановіч, Н.Л. Праблема асобы на мяжы XIX–XX стагоддзяў / Н.Л. Бахановіч // Шостыя Танкаўскія чытанні: да 125-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа і 95-годдзя з дня нараджэння М. Танка : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А.І. Лугоўскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 14–15.

7. Бахановіч, Н.Л. Трагедыя талента і дылетанта: творчая асоба ў пачатку XX стагоддзя / Н.Л. Бахановіч // Polsko-białoruskie związki literackie, językowe i historyczne-kulturalne / Katedra Białorutenistyki Uniw. Warszawskiego ; red. nauk.: M. Timoszuk, M. Chaustowicz. – Warszawa, 2008. – S. 8–16. – (Acta Albaruthenica ; 8).

### Матэрыялы навуковых канферэнцый

8. Бахановіч, Н.Л. Закон захавання энергіі ў літаратуры: на матэрыяле апавядання "Трэснуты звон" У. Рэйманта і казкі "Жывая вада" Я. Коласа / Н.Л. Бахановіч // Идеи. Поиски. Решения : материалы I Респ. науч.-практ. конф., Минск, 28 марта 2008 г. : в 2 т. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Н.Н. Нижнева (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2008. – Т. 2. – С. 49–52.

9. Баханович, Н.Л. Белорусская литература и проблема человека на границе XIX–XX столетий: актуальность исследования / Н.Л. Баханович // Проблемы славянской культуры и цивилизации : материалы X Междунар. науч.-метод. конф., Уссурийск, 22 мая 2008 г. / Уссур. гос. пед. ин-т ; отв. ред. А.М. Антипова. – Уссурийск, 2008. – С. 350–353.

10. Баханович, Н.Л. Художественное исследование старости на рубеже XIX–XX веков / Н.Л. Баханович // Ломоносов – 2009 : материалы XVI Междунар. науч. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых. Секция "Филология", Москва, 13–17 апр. 2009 г. / М-во науки и образования Рос. Федерации, Моск. гос. ун-т ; редкол.: Е.И. Кислова (ред.-сост.). – М., 2009. – С. 238–240.

11. Бахановіч, Н.Л. Праблема творчай асобы ў апавяданні "Бондар" З. Бядулі / Н.Л. Бахановіч // Выяўленча-мастацкія, арганізацыйныя і ідэалагічныя праблемы сучаснай беларускай літаратуры ў яе сувязях з грамадскімі практыкамі : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 19–20 мая 2009 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: М.А. Тычына (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 222–226.

12. Бахановіч, Н.Л. Мастацкае перажыванне старасці як індыкатар пераходнага грамадства / Н.Л. Бахановіч // Юбилейная научно-практическая конференция : [посвящ. 40-летию Гомел. гос. ун-та] : материалы, Гомель, 11 июня 2009 г. : в 4 ч. / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т ; рэдкол.: О.М. Демиденко (отв. ред.) [и др.]. – Гомель, 2009. – Ч. 1. – С. 177–180.

13. Бахановіч, Н.Л. Асоба ў цыклічнай мадэлі культурна-гістарычнага хранатопа / Н.Л. Бахановіч // Droga ku wzajemności: polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe : materiały XI Miedz. nauk. konf., Białystok, centrum "Trzy Sosny", 25–26 wrześ. 2009 r. / T-wo kultury białorus., Grodz. uniw. państ., Związek pol. na Biał. ; red.: M. Kondratiuk, B. Siegień. – Białystok, 2009. – S. 345–351.

14. Бахановіч, Н.Л. Пакута як ідэйна-мастацкі прынцып рэпрэзентацыі асобы ў лірычнай прозе Змітрака Бядулі / Н.Л. Бахановіч // Творчасць Івана Навуменкі: славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст : матэрыялы Рэсп. навук. канф. да 85-годдзя з дня нараджэння нар. пісьменніка Беларусі акад. І. Навуменкі, Мінск, 16 лют. 2010 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: С.С. Лаўшук (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 113–117.

15. Баханович, Н.Л. Сон как способ творчества в миниатюрах Ежи Жулавского / Н.Л. Баханович // Ломоносов – 2010 [Электронный ресурс] : материалы XVII Междунар. науч. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых. Секция "Филология", 12–15 апр. 2010 г. – М. : МАКС Пресс, 2010. –

Режим доступа : http://www.lomonosov-msu.ru/archive/Lomonosov_2010/24-6.pdf. – Дата доступа : 4.02.2012.

16. Бахановіч, Н.Л. Максім Багдановіч і Змітрок Бядуля: мастацкі дыялог пра творцу / Н.Л. Бахановіч // Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф. да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, Мінск, 25–26 лістап. 2011 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: А.А. Манкевіч (уклад.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 61–64.

# РЭЗЮМЭ

**Бахановіч Наталля Леанідаўна**

## КАНЦЭПЦЫЯ АСОБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ПРОЗЕ МАЛЫХ ЖАНРАЎ НА ПАМЕЖЖЫ XIX–XX СТСТ.

**Ключавыя словы:** кампаратывістыка, проза малых жанраў, лірычная проза, асоба, аўтар, герой, паэтыка, хранатоп, сімволіка, матыў, цыклічнасць, персаналізацыя і дэперсаналізацыя, пераходны перыяд, творчая асоба.

**Мэта дысертацыі –** выявіць канцэпцыю асобы як анталагічна-мастацкі комплекс ідэй зыходзячы з мадэлей яе рэалізацыі ў межах беларускай і польскай прозы малых жанраў і ва ўзаемасувязі з сацыякультурным кантэкстам мяжы XIX–XX стст.

**Метады даследавання.** У працэсе рэалізацыі мэты выкарыстаны герменеўтычны, культурна-гістарычны, параўнальна-тыпалагічны метады аналізу.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Упершыню праведзена кампаратыўнае даследаванне канцэпцыі асобы ў беларускай і польскай малафарматнай прозе канца XIX – пачатку XX ст. Вызначаны культурна-гістарычныя ўмовы фарміравання мастацкай канцэпцыі асобы на памежжы стагоддзяў. Асэнсаваны патэнцыял прозы малых жанраў у аспекце рэпрэзентацыі вобраза чалавека. Прааналізаваны шэраг мадэлей, прыёмаў і спосабаў рэалізацыі канцэпцыі асобы. Выяўлена яе матывацыйна-функцыянальная значнасць як фундаментальнага комплексу сэнсаў у беларускім і польскім сацыякультурным кантэксце. Пераважная частка польскіх твораў уведзена ў айчынны навуковы зварот упершыню.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні і галіна прымянення атрыманых вынікаў.** Вынікі дысертацыі будуць запатрабаваны пры далейшым даследаванні беларускай і польскай літаратур, у тым ліку і ў галіне кампаратывістыкі, у навукова-адукацыйнай сістэме гуманітарнага профілю. Практычная значнасць вынікаў заключаецца ў магчымасці іх выкарыстання ў працэсе асэнсавання анталагічнага, гнасеалагічнага, аксіялагічнага аспектаў жыццядзейнасці чалавека, падчас ажыццяўлення міждысцыплінарнай рэканструкцыі канцэпцыі асобы і распрацоўкі комплексных праграм духоўнага развіцця нацыі.

# РЕЗЮМЕ

**Баханович Наталья Леонидовна**

## КОНЦЕПЦИЯ ЛИЧНОСТИ В БЕЛОРУССКОЙ И ПОЛЬСКОЙ ПРОЗЕ МАЛЫХ ЖАНРОВ НА РУБЕЖЕ XIX–XX СТСТ.

**Ключевые слова:** компаративистика, проза малых жанров, лирическая проза, личность, автор, герой, поэтика, хронотоп, символика, мотив, цикличность, персонализация и деперсонализация, переходный период, творческая личность.

**Цель диссертации** – выявить концепцию личности как онтологично-художественный комплекс идей исходя из моделей ее реализации в рамках белорусской и польской прозы малых жанров и во взаимосвязи с социокультурным контекстом рубежа XIX–XX вв.

**Методы исследования.** В процессе реализации цели использованы герменевтический, культурно-исторический, сравнительно-типологический методы анализа.

**Полученные результаты и их новизна.** Впервые проведено компаративное исследование концепции личности в белорусской и польской малоформатной прозе конца XIX – начала XX ст. Определены культурно-исторические условия формирования художественной концепции личности на рубеже столетий. Осмыслен потенциал прозы малых жанров в аспекте репрезентации образа человека. Проанализирован ряд моделей, приемов и способов реализации концепции личности. Выявлена ее мотивационно-функциональная значимость как фундаментального комплекса смыслов в белорусском и польском социокультурном контексте. Преобладающая часть польских произведений введена в отечественный научный оборот впервые.

**Рекомендации по использованию и область применения полученных результатов.** Результаты диссертации будут востребованы при дальнейшем исследовании белорусской и польской литератур, в том числе в отрасли компаративистики, в научно-образовательной системе гуманитарного профиля. Практическая значимость результатов заключается в возможности их использования в процессе осмысления онтологического, гносеологического, аксиологического аспектов жизнедеятельности человека, во время осуществления междисциплинарной реконструкции концепции личности и разработки комплексных программ духовного развития нации.

## SUMMARY

**Natalia Bahanovich**

# THE CONCEPT OF PERSONALITY IN THE BELARUSIAN AND POLISH SHORT GENRE PROSE AT THE TURN OF 19–20 CENTURIES

**Key words:** comparative studies, short prose genre, lyric prose, personality, author, hero, poetics, chronotope, symbolism, motif, cyclicity, personalization and depersonalization, transitional period, creative personality.

**The purpose of research –** to reveal the personality concept as an ontological artistic complex of the ideas proceeding from the models of its realization within the bounds of Belarusian and Polish short prose genre and in the interconnection with the socio cultural context at the turn of 19–20 centuries.

**The methods of research.** In the process of research were used hermeneutical, cultural-historical, comparative-typological methods of analysis.

**The obtained results and their novelty.** For the first time a comparative research of the personality concept in the Belarusian and Polish small-format prose of the late 19 – early 20 century was conducted. The cultural-historical terms of the artistic personality concept formation at the turn of centuries are defined. The short prose genre potential is comprehended in the aspect of person representation. A number of models, examples and methods of personality concept realization is analyzed. Its motivational functional significance as a fundamental complex of senses in Belarusian and Polish socio-cultural context is revealed. For the first time the dominant part of Polish writings is introduced into the national scientific usage.

**The results use and the field of their applying.** The dissertation results will be useful for further research of Belarusian and Polish literatures, as well as for comparative field and educational system of humanitarian profile. The practical significance of the results is in the opportunity of their use in the interpretation of the ontological, gnosiological, axiological aspects of human life, during the reconstruction of interdisciplinary concept of the individual and the development of integrated programs of nation spiritual development.